камбінат гарадскіх школ.

Аўстэрыя – помнік архітэктуры рэспубліканскага значэння.

Міхал Казімір Агінскі, быццам чараўнік, зрабіў цуд:ператварыў правінцыйны невядомы гарадок у буйны еўрапейскі асяродак культуры.

Літаратура:

1. Аляшкевіч Д.С.; Крэнь І.П., “Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў”. – Слонім. Слонімская друкарня, 2002г.
2. Чыгрын С., “Тэатр у Слоніме” гісторыка-краязнаўчыя і мастацтвазнаўчыя артыкулы. – г. Слонім. Слонімская друкарня, 2008г.;
3. Цеханавецкі,А.Міхал Казімір Агінскі і “яго сядзіба музаў” у Слоніме. – Мн.:Беларусь,1993. – 176 стр.

## «ТАПАНІМІЯ СМАРГОНШЧЫНЫ»

УА «Гімназія №4 г. Смаргонь»

***Чырыца І.Я., ПФ***

Навуковы кіраўнік – Радзіён Л.У., настаўніца беларускай мовы і літаратуры

У спадчыну ад мінулых пакаленняў нам дасталася велізарная колькасць назваў населеных пунктаў, рэк і азёр, палёў і сенажацяў. На зямлі нашай Бацькаўшчыны не знойдзеш ніводнай назвы, якая б узнікла выпадкова. Калі ўважліва паглядзець, то выразна бачна, што яна паходзіць ці ад прыродных асаблівасцей асяроддзя, ці ад умоў вытворчай дзейнасці людзей, ці звязана з гістарычным мінулым народа, ці ўказваюць на прыналежнасць той ці іншай асобы.

Многія гістарычныя тапонімы найцяснейшым чынам звязаны з геаграфічнымі і прыродна-кліматычнымі фактарамі, бо яны ўзнікалі па берагах рэк і азёр , г.зн. у месцах, дзе найлепш за ўсё можна было ладзіць жыццё чалавеку. У беларускім алфавіце, бадай, няма ніводнай літары ,з якой не пачыналася б назва населенага пункта, у якой угадваецца штосьці з мясцовага ландшафту. У беларусаў ,як і ў іншых народаў, велізарны пласт тапаніміі так ці інакш звязаны з рэлігійнай тэматыкай. І тут няма нічога дзіўнага, бо пакуль беларусы прыйшлі да матэрыялістычнага разумення свету, у іх свядомасці многія прыродныя і сацыяльныя з`явы паўставалі ў розных містычных, незямных формах.

Існуе навука пра назвы – анамастыка, і ў ёй вялікі раздзел-тапаніміка. Слова гэта грэчаскае, складаецца з двух частак: топас-мясцовасць, месца і анома-імя. Карацей кажучы, імя месца, звязанага з

Репозиторий ГрГМУ

жыццём чалавека, геаграфічная назва.Тапаніміка – навука пра паходжанне геаграфічных назваў і ўсялякіх, з гісторыяй павязаных змен, якія адбываюцца ў слоўным вызначэнні мясцін, паселішчаў і гарадоў, рэк, азёраў, лясоў, балот і іншых прыродных утварэнняў. Але тапаніміка, як навука, знаходзіцца на сустрэчы некалькіх галін ведаў: мовазнаўства, геаграфіі, гісторыі. Назва не можа ўзнікнуць без таго , каб чалавек не валодаў мовай ,здольнай аформіць словам зробленае ім адкрыццё. Разам з тым на слова, якім выяўляецца назва, уплывае геаграфічны характар мясцовасці і часта памагае дакапацца да сапраўднага сэнсу той ці іншай тутэйшай назвы яе. І, нарэшце, гісторыя грамадства, якое стварае назву, дае ёй грамадзянскае, сацыяльнае тлумачэнне, аднесенае да перыяду яе ўзнікнення. Вось чаму так важна заглыбляцца ў самыя старажытныя дакументы, кнігі. Нават тыя, што захоўваюцца ў мясцовых бібліятэках, архівах, праліваюць дадатковае святло для больш дакладнага ўстанаўлення вытокаў розных назваў (мясцін, імён і прозвішчаў жыхароў).

У ходзе даследавання тапонімаў Смаргонскага раёна мною сабрана больш 300 назваў населеных пунктаў, рэк, азёр, урочышчаў. Зыходзячы з гэтага, усе тапонімы паводле значэння падзелены на:

а) айконімы;

б) гідронімы;

в) аронімы (мікратапонімы).

Айконімы – уласныя назвы населеных пунктаў.

На Смаргоншчыне значная колькасць айконімаў мае патранімічнае паходжанне (ад імён, прозвішчаў людзей). Даволі вялікі пласт складаюць айконімы прыродна-геаграфічнага паходжання, а таксама айконімы, звязаныя з працоўнай дзейнасцю і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі жыцця людзей.

Фарміраване беларускай народнасці праходзіла ва ўмовах самых цесных сувязей з іншымі плямёнамі, асабліва балцкага паходжання, якія таксама жылі на гэтай тэрыторыі. Таму я магу назіраць айконімы этнанімічнага паходжання. Тэрмін этнонім паходзіць ад грэчаскага слова і ўжываецца для абазначэння назвы племя, народнасці, нацыі, народа і іншых этнічных супольнасцяў.

Гідронімы – назвы водных аб’ектаў (рэк, азёр і інш.). Многія гідронімы Смаргонскага раёна ўзніклі ў старажытныя часы і ў сваёй аснове захоўваюць моўныя асаблівасці тых народаў, якія насялялі землі нашай Бацькаўшчыны.

Мікратапонімы – назвы дробных геаграфічных аб’ектаў вакол аднаго населенага пункта ці на абмежаванай тэрыторыі. Паняцце ўключае ўласныя назвы палёў, лясоў, балот, узгоркаў, ручаёў, брадоў, каналаў, дарог і інш. Большасць мікратапонімаў Смаргоншчыны паходзіць ад імёнаў і прозвішчаў людзей.

Асноўную групу на тэрыторыі Смаргонскага раёна, як і на тэрыторыі



Репозиторий ГрГМУ

Беларусі, складаюць тапонімы, якія паходзяць ад уласных імён. Найчасцей гэта кананізаваныя асобовыя імёны ў іх размоўна-бытавой форме, прозвішчы, мянушкі людзей.

На Смаргоншчыне можна сустрэць тапонімы, якія паходзяць ад такіх распаўсюджаных імён, як Васіль, Іван (бел. варыянт – Ян), Сямён, Міл (рус.Нiл), Міхал і інш.

Так, на тэрыторыіі раёна існуюць дзве назвы, утвораныя ад відазмененага ўласнага імя Васіль (Васюкі – Каранёўскі с/с, Васілевічы – Бялкоўшчынскі с/с).

Ад імя Сямён і вытворных ад яго прозвішчаў паходзяць наступныя дзве назвы:

Аб прысутнасці татараў на тэрыторыі Смаргонскага раёна сведчаць назвы, якія паходзяць ад татарскіх імён:

*Гамзічы – назва-мянушка: гамза – бубнівы чалавек, магмыма, паходзіць ад татарскага імя Гамза.*

*Касымава – назва цюркскага паходжання ад імя Касым (у перакладзе – той, хто дзеліць, раздзяляе).*

Значную колькасць у нашай мясцовасці складаюць тапонімы, якія паходзяць ад прозвішчаў:

*Дзевятні – назва паходзіць ад прозвішча ў аснове лічэбнік "дзевяць",прычыны паходжання могуць быць розныя: дзевяты сын ці дачка, дзевяты раздзел ці ўчастак.*

*Гарбачы – назвы, утвопаныя ад мянушкі ці прозвішча.*

*Войневічы – назва, магчыма, утворана ад распаўсюджанага ў Беларусі прозвішча, вытворнага ад асновы "война" ці ад літ. дзеяслова vainoti – сварыцца, лаяцца, ганьбаваць.*

На тэрыторыі Смаргонскага раёна сустракаюцца толькі два тапонімы, якія нагадваюць рэлігійна-культавае паходжанне:

*Талмуцішкі – назва, магчыма, паходзіць ад слова "талмуд",што ўказвае на прыналежнасць жыхароў да іудзейскага веравызнання.*
*Каранды – назва цюркскага паходжання. У аснове слова "кара"*

- люты, чорны, злы дух ці вюдзьмак. У тапаніміцы
- праз прозвішча цюркскага паходжання.

Пад час даследавання на тэрыторыі Смаргонскага раёна выяўлена



Репозиторий ГрГМУ

нямала назваў, звязаных з ландшафтнымі асаблівасцямі мясцовасці.

*Трылесіна – у аснове назвы спалучэнне слоў "тры лясы", "тры лесіны".*

*Снігяны – назва-характарыстыка: месца, дзе вясной даўжэй затрымліваецца снег – паўночныя схілы яроў, зацененыя ўзлескі.*

Невялікая група назваў, звязаных з жывёльным светам нашага краю (заатапонімы).

*Тушчанка – назва ракі, магчыма, паходзіць ад асновы, устарэлай назвы жывёлы ласкі, часам гарнастая, назва захавалася ў дыялектах.*

*Калпяя – у аснове – назва птушкі колпіцы, жыццё якой звязана з воднымі аб'ектамі. журавель.*

## СЕКЦИЯ РУССКИЙ ЯЗЫК И КУЛЬТУРА

## ПОДСЕКЦИЯ 1

# «СИСТЕМНЫЕ СВЯЗИ УСТОЙЧИВЫХ ГЛАГОЛЬНО-ИМЕННЫХ СЛОВОСОЧЕТАНИЙ, ВЫРАЖАЮЩИХ ФАЗОВОСТЬ»

***Агилинко Бертранд, ФИУ***

Научный руководитель – преподаватель кафедры русского и белорусского языков Е.А. Дымова

Наиболее соответствуют природе фазовости такие системные отношения, как синонимия и антонимия.

Словосочетания-синонимы выражают одну и ту же фазу одного и того же процесса. В синонимические отношения вступают как словосочетания, выражающие начинательность (*завязать знакомство – завести знакомство, поднять рев – удариться в рев*), бытийность (*быть в ссоре – находиться в ссоре, вести бой – находиться в бою*) и завершительность (*отбросить сомнения – оставить сомнения, утратить веру – потерять веру*). На основе общего фазового значения выделяются не только пары синонимов, но и синонимические ряды (*приступить к работе – приняться за работу – взяться за работу – возобновить работу – развернуть работу – включиться в работу*).



Репозиторий ГрГМУ